Людка СІЛЬНОВА

# Маленькі Скарына

**Мікрапаэма**





*Малюнкі Сяргея ВОЛКАВА*

У Полацку слаўным, ля рэчкі
Хлапчынка няўрымслівы жыў.
Францішак Скарына маленькі
Вялікія мэты любіў.

Ля полацкай школы пад вішняй
Ён літары ўслых паўтараў:
“Аз”, “букі”, “дабро”… Хутка ў Вільні
Настаўнікаў строгіх скараў.

Было, што “баляку-маляку”
Ён крэмзаў і меў кухталя…
Падрослы Францішак у Кракаў
Паехаў вучыцца пасля.

Спазнаць там далёка навукі
Адважны Францішак рашыў!
Не стра́шыла — выпэцкаць рукі
Аб часткі нязнаных “машын”.

Было гарадоў розных пышных!
З вучонымі дыспутаваў…
Асветнікам стаў наш Францішак:
Ён “Біблію руску” — па кніжках
Асобных — шмат год друкаваў.

А каб іх хутчэй раскупалі,
Чытаць пачыналі хутчэй —
Гравюрамі іх аздаблялі
Для радасці родных вачэй!

Павозкі дарожныя ў брудзе
Дарожным, а сам — пад дажджом.
Абы — усім дзеткам і людзям
Цуд-кнігі прывезці на дом.

Ён вёз, каб у кожнае хаце
Чыталі “Юдзіф” і “Псалтыр”,
У замку і княжым палацы
Мудрэў гаспадар, правадыр…

**Палічыце, колькі год спаўняецца першаму выданню Францыска Скарыны ў 2022 г.? Ці ведаеце вы, што гэта за выданне і дзе яно было надрукавана?**




***Людміла (Людка) СІЛЬНОВА (нар. 20.04.1957 г.) —***
*беларуская пісьменніца. Працуе галоўным бібліёграфам у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Верш пра першадрукара ў 2017 г. прысвяціла 500-годдзю беларускага кнігадрукавання.*